**КУПА́ЛА** Янка (сапр. Л у ц э в і ч Іван Дамінікавіч, 7.7.1882, б. фальварак Вязынка Маладзечанскага р-на — 28.6.1942), класік беларускай літаратуры; адзін з заснавальнікаў сучаснай бел. л-ры і бел. літ. мовы. Нар. паэт Беларусі (1925). Акадэмік НАН Беларусі (1928) і АН Украіны (1929). Скончыў нар. вучылішча ў в. Бяларучы (цяпер Лагойскі р-н, 1898), вучыўся на агульнаадукац. курсах А.С.Чарняева ў Пецярбургу (1909—13) і ў нар. ун-це імя А.Л.Шаняўскага ў Маскве (1915). Працаваў хатнім настаўнікам, пісарам, малодшым прыказчыкам. У 1908—09 супрацоўнік газ. «Наша ніва» (у 1914—15 рэд.) і адначасова б-кі Б.Даніловіча (Вільня), з 1913 — сакратар віленскага Бел. выдавецкага т-ва. У 1916—18 у арміі. Са студз. 1919 у Мінску, шмат друкаваўся як паэт і публіцыст, з 1921 прымаў актыўны ўдзел у літ.-грамадскім і культ.-маст. жыцці, у т.л. ў стварэнні БДУ, АН Беларусі, нац. тэатра, рэсп. выд-ва і інш. У Вял. Айч. вайну жыў у Маскве, пазней у пас. Печышчы недалёка ад Казані. Трагічна загінуў у Маскве. Пісаць пачаў на польск. мове. Першы вядомы верш К. «Мая доля» датуецца 1904. Першы бел. друкаваны верш «Мужык» (1905). Першы паэт. зб. «Жалейка» (1908). Творчасць К. — адлюстраванне нац. характару, нар. светаразумення і паэт. светапогляду бел. народа ў пераломныя моманты 1-й пал. 20 ст. У жанрава-стылявых формах, якія сталі класічнымі асновамі бел. лірыкі, эпасу, драматургіі і публіцыстыкі, увасоблены свабодалюбівыя матывы, ідэі сац. і нац. разняволення, гіст. мінулае Беларусі, філас. асэнсаванне жыцця і чалавека і інш. Ранняя лірыка К. эвалюцыяніравала ад пераважна сялянскай тэматыкі (зб. «Жалейка») да больш выразнага адлюстравання асобы паэта, узнясення асабістага паэт. «Я» (зб. «Гусляр», 1910; «Шляхам жыцця», 1913). Пераважала бел. нац. ідэя («А хто там ідзе?», «Гэта крык, што жыве Беларусь», «Сваякі», «На сход!» і інш). Эстэтыка творчасці К. разнастайная: ад рамантызму да сімвалізму і неарамантызму (паэмы «Адвечная песня», «Сон на кургане», «Яна і я»). Як паэт-рамантык зацвердзіў рамантычны тып нац. лірыкі, у якім арганічна спалучаецца лірызм і рамантычная незвычайнасць успрыняцця з традыцыямі бел. фальклору — вобразамі і матывамі, паэтыкай бел. нар. песні, міфал. уяўленнямі, каларытам бел. легенд, казак, паданняў. Фалькл.-рамантычная паэма «Курган» (1910) прасякнута ідэяй бессмяротнасці нар. мастацтва, «Бандароўна» (1913) — гераікай нар. барацьбы супраць прыгнятальнікаў, «Яна і я» (1913) — ідэалізаваным уяўленнем селяніна-працаўніка аб шчасці. Праблемы ўзаемаадносін рамантычнага бунтара, нар. заступніка і сялянскага асяроддзя, выключнасці асобы і народа разглядаў у паэмах «Сон на кургане» (1910) і «Магіла льва» (1913, аднайм. фільм 1971). У паэме «Тарасова доля» (1939) — паэтызацыя жыццёвага шляху ўкр. пісьменніка Т.Шаўчэнкі. К. паспяхова вырашаў задачу стварэння бел. нац. камедыі і драмы («Паўлінка», 1912, аднайм. фільм-спектакль 1952; «Раскіданае гняздо», 1913, аднайм. фільм 1982). Вяршыня яго сатыр. камедыяграфіі — трагікамедыя «Тутэйшыя» (1922, паст. 1926, 1990), якая адлюстроўвае разбітыя ілюзіі, паказвае горкія явы паслярэв. рэчаіснасці, высмейвае вялікадзярж. шавінізм. Творы 1920—30-х гг. аб'яднаны ў зб. «Безназоўнае» (1925) і «Ад сэрца» (1940). Апошнія вершы паэта напісаны ў гады Вял. Айч. вайны («Беларускім партызанам», «Зноў будзем шчасце мець і волю», «Грабежнік»). У ранняй публіцыстыцы К. ўзнімаў пытанні паляпшэння сац. становішча народа Беларусі, што спрыяла абуджэнню нац. самасвядомасці («Чаму плача песня наша?», 1913; «Вера і нацыянальнасць», 1914; «Беларускі сцяг уваскрос!», «Незалежнасць», абодва 1919 і інш.). Яго літ.-крыт. творы спрыялі ідэйна-маст. росту бел. л-ры. К. належаць пераклады (празаічны і вершаваны) на бел. мову «Слова аб палку Ігара-



*Я.Купала.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вым», твораў А.Міцкевіча, Т.Шаўчэнкі, А.Пушкіна, М.Канапніцкай, лібрэта оперы «Галька» С.Манюшкі. Яго творы перакладзены на шматлікія мовы свету. П'есы К. ставяцца ў бел. тэатрах. Па яго творах напісаны оперы «Машэка» Р.Пукста, «Раскіданае гняздо» М.Чуркіна, опера-прытча «Песня пра долю» У.Мулявіна, балеты «Выбранніца» і «Курган» Я.Глебава, муз. камедыя «Паўлінка» Ю.Семянякі, сімфоніі, вак.-сімф. паэмы і інш. Вобраз паэта ўвасоблены ў творах выяўл. мастацтва, да яго юбілеяў прымеркаваны маст. выстаўкі (1972, 1982, 1992, 2002, 2012). Жыццю і творчасці К. прысвечаны хранікальна-дакум. фільмы «А зязюля кукавала...» (1972, рэж. В.Дашук), «Шлях паэта» (1988, рэж. У.Каралёў), тэлефільмы «За шчасцем, за сонцам» (1970, рэж. В.Раеўскі, В.Акімушкін), «Янка Купала. «Паклон мой народу за песні...» (1981), «Янка Купала» (1982, абодва рэж. І.Калоўскі), «Ніколі я не ўміраў» (1992), «Імша па Купалу» (1993, абодва рэж. В.Бакун), відэафільм «Знойдзеш Айчыну блізка» (1998, рэж. М.Якжэн). З 1946 у БДУ штогод праводзяцца Купалаўскія чытанні. Дзейнічаюць *Купалы Янкі літаратурны музей у Мінску, Купалы Янкі літаратурнага музея філіял «Акопы», Купалы Янкі літаратурнага музея філіял «Вязынка», Купалы Янкі літаратурнага музея філіял «Ляўкі», Купалы Янкі літаратурнага музея філіял «Яхімоўшчына»*, створаны *Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка»* і *Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Ляўкі»*. З 1965 прысуджаецца Дзярж. прэмія Беларусі яго імя. У 1986 выдадзены энцыклапедычны даведнік «Янка Купала». Яго імем названы Ін-т л-ры НАН Беларусі, Нац. акадэмічны тэатр у Мінску, Гродзенскі ўн-т, пасёлак у Глускім і вёска ў Пухавіцкім р-нах, б-кі, школы, вуліцы ў гарадах і нас. пунктах Беларусі. Помнікі К. пастаўлены ў Вязынцы, Ляўках (Аршанскі р-н), Маскве, Мінску, Радашковічах, Араў-парку (Нью-Ёрк). У 1996 створаны Міжнар. фонд К. Творчасць К. вывучае *купалазнаўства*.

*Тв.*: Поўны збор твораў. Т.1—9. Мінск, 1995—2003; Выбраныя творы, Мінск, 2002; Паўлінка: камедыя ў 2 актах. Мінск, 2006; Тутэйшыя: трагічна-смяшлівыя сцэны ў 4 дзеях. Мінск, 2006; Мая малітва: вершы, паэмы. Мінск, 2007; Молодая Беларусь: стихотворения, поэмы, публицистика: пер. с белорус. М., 2008.

*Літ.*: Лойка А. Як агонь, як вада... Раман-эсэ пра Янку Купалу. Мінск, 1984; Гніламёдаў У. Янка Купала: Жыццё і творчасць. Мінск, 1995; Ліпскі У.С. Янкаў вянок: дзецям пра Я.Купалу. Мінск, 2009; Тычко Г.К. Беларускай песні ўладар. Мінск, 2010; Рукапісная спадчына Янкі Купалы. Мінск, 2010.

*В.І.Еўмянькоў.*